Аўсейчык, У.Я. Гісторыя вывучэння пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў першай палове XX стагоддзя // Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі да 150-годдзя А. К. Сержпутоўскага ; 19-20 чэрвеня 2014 г., г. Мінск / уклад. А. Г. Алфёрава, С.У.Груntoў, Ю.С.Пракоф'ева; рэдкал. : А.І. Лакотка [і інш.]; НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры. – Мінск : Права і эканоміка, 2014. – С. 102-107.

***Аўсейчык У.Я.***

# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX СТАГОДДЗЯ[1]

*Установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»*

Даследаванне пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ўяўляе вельмі важны і актуальны накірунак у беларускай этналагічнай навуцы. Пахавальныя і памінальныя абрады з'яўляюцца найбольш устойлівай і кансерватыўнай часткай культуры, а таму больш трывала захоўваюць этнічную спецыфіку. Яны надзвычай інфармацыйныя, вельмі важныя для вывучэння этнічных працэсаў, а таксама дазваляюць выявіць узаемасувязі абрадавых комплексаў сямейнага і каляндарнага цыклаў на розных этапах развіцця этнасу. Даследаванне пахавальна-памінальнай абраднасці садзейнічае разуменню іншых праяў самабытнай духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў.

Правядзенне найбольш эфектыўнага даследавання немагчыма без падсумавання вопыту папярэднікаў, якія вывучалі гэты сегмент народнай культуры, без аналізу і характарыстыкі тых прац, што былі прысвечаны азначанай праблематыцы. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз прац па пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, якія былі апублікаваны ў першай палове XX ст. У артыкуле прааналізаваны толькі этнаграфічныя даследаванні пахавальных і памінальных абрадаў. Акрамя таго, у першай палове XX ст. па дадзенай праблематыцы апублікаваны шэраг

[1] Артыкул падрыхтаваны ў ходзе працы па тэме «Этнакультурны ландшафт Беларускага Падзвіння: рэгіянальная спецыфіка і заканамернасці функцыянавання ў сярэдзіне XIX – пачатку XXI ст.» (ГБ 0814).

прац беларускіх археолагаў, характар і спецыфіка якіх патрабуюць асобнага разгляду.

У пачатку XX ст. у этнаграфічных даследаваннях пахавальна-памінальнай абраднасці пераважаў збор, першасная апрацоўка і публікацыя этнаграфічных матэрыялаў. У гэты перыяд апублікаваны этнаграфічныя нарысы А. Р. Пшчолкі аб беларусах Лепельшчыны [6–8]. Навуковая дзейнасць даследчыка пачалася яшчэ напрыканцы XIX ст. Адна з першых публікацый аўтара па пахавальна-памінальнай абраднасці мела назву «Дзяды. Этнаграфічны нарыс з жыцця Лепельскіх беларусаў» (1898 г.) [6]. У нарысе апісаны памінальныя звычаі і абрады жыхароў в. Падмікітаўка Лепельскага павета Віцебскай губерні, прымеркаваныя да восеньскіх Дзядоў. У 1901 г. А. Р. Пшчолка надрукаваў нарыс «Мікітавы хаўтуры» ў некалькіх нумарах «Віцебскіх губернскіх ведамасцей». Асобным выданнем нарыс апублікаваны ў 1910 г. [7]. У ім апісана пахаванне аднаго сельскага жыхара Мікіты. У творы паэтапна апісаны абрад пахавання, змешчаны тэксты галашэнняў. Аўтар у гэтай працы звяртае ўвагу на празмернае ўжыванне беларускім вясковым насельніцтвам алкаголю ў час памінання памерлых. Гэтую з’яву А. Р. Пшчолка адзначае і ў кнізе «Нарысы і расказы з жыцця беларускай вёскі», у раздзеле «Гарэлка на хаўтурах» [8, с. 69–73]. Ён паведамляе нават пра выпадак, калі сяляне не прыйшлі на хаўтуры, на якіх не ўжывалі гарэлкі [8, с. 70]. Нягледзячы на сваю белетрызаванасць і мастацкую апрацоўку, нарысы А. Р. Пшчолкі змяшчаюць каштоўныя матэрыялы аб асаблівасцях пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Лепельшчыны.

Вялікая работа, якая была праведзена даследчыкамі па зборы і публікацыі этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў па пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння ў папярэднія перыяды, асабліва ў другой палове XIX ст., стала добрым падмуркам для далейшага развіцця даследаванняў у гэтым накірунку. Багатыя фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы становяцца асновай для напісання адпаведных раздзелаў у абагульняючых працах аб беларускіх землях і беларускім этнасе. Пэўную

цікавасць сярод агульнаэтнаграфічных прац пачатку XX ст. мае IX том выдання «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай Айчыны» (1905 г.), у якім утрымліваюцца матэрыялы, сабраныя на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Смаленскай губерняў. Гістарычна-этнаграфічныя раздзелы кнігі былі напісаны М. В. Доўнар-Запольскім і Д. З. Шэндрыкам. У раздзеле «Размеркаванне насельніцтва Верхняга Падняпроўя і Беларусі на тэрыторыі, яго этнаграфічны склад, побыт і культура» змешчана характарыстыка пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў [13, с. 179–183]. У працы падрабязна апісаны пахавальныя і памінальныя абрады, прааналізаваны пахавальныя галашэнні. Характарыстыка пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў у дадзеным выданні мае абагульняючы характар. Аўтары апісваюць шэраг лакальных варыянтаў абрадавых дзеянняў, але не заўсёды ўказваюць рэгіён іх распаўсюджання. М. В. Доўнар-Запольскі і Д. З. Шэндрык адзначаюць некаторыя асаблівасці пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння. Многія матэрыялы для напісання гэтага раздзела былі ўзятыя з прац М. Анімеле [1], М. Я. Нікіфароўскага [4], П. В. Шэйна [11–12].

Шэраг матэрыялаў, якія адносяцца да пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, ёсць на старонках перыядычнага друку пачатку XX ст. Некаторыя звесткі аб памінальных традыцыях змешчаны ў артыкуле «Памінанне нябожчыкаў (з прыхадскога жыцця)», які быў надрукаваны ў неафіцыйным аддзеле «Полацкіх епархіяльных ведамасцей» за 1906 г. (№20) [9]. Аўтар яго невядомы, застаўся толькі псеўданім Свой. У гэтай публікацыі прыведзены заўвагі аўтара пра памінальныя абрады ў Дзмітраўскую суботу. Пры іх апісанні аўтар звяртае ўвагу на адну «ненармальнасць». Ён адзначае, што з-за вялікай колькасці прадуктаў харчавання, якія прыносяць сяляне ў гэты дзень у храм, святары скормліваюць іх хатняй жывёле [9, с. 716].

У пачатку XX ст. значная колькасць этнаграфічных даследаванняў, прысвечаных беларусам, была змешчана ў перыядычных выданнях Рускага

геаграфічнага таварыства (РГТ). У «Запісках» Паўночна-Заходняга аддзялення РГТ за 1910 г. была апублікавана праца В. В. Іванова «Прыметы і павер’і сялян Віцебскага павета Віцебскай губерні» [2]. У гэтым артыкуле змешчаны шэраг прыкмет і павер’яў, што адносяцца да пахавальнай абраднасці мясцовага беларускага насельніцтва [2, с. 208, с. 213].

Пахавальна-памінальную абраднасць беларускага этнасу разгледзеў у сваім фундаментальным трохтомным даследаванні «Беларусы» Я. Х. Карскі. Гэтай праблематыцы аўтар прысвяціў асобны раздзел першага выпуску III тома «Беларусаў» (1916 г.), які мае назву «Абрады пры пахаванні і памінальныя галашэнні» [3, с. 295–324]. Даволі падрабязна аўтар спыняецца на аналізе пахавальных галашэнняў. На іх аснове навуковец імкнецца рэканструяваць погляды беларусаў на смерць і замагільнае жыццё. Карскі аналізуе і памінальную абраднасць беларусаў. Ён вылучае два віды памінак: «прыватныя» і «агульныя». З ліку апошніх галоўнымі называе Радаўніцу і Дзмітраўскія Дзяды [3, с. 321]. Агульная характарыстыка памінальнай абраднасці на Вялікдзень і Радаўніцу ёсць у раздзеле «Вясеннія абрады і песні» [3, с. 263, с. 266–269], а на Тройцу – у раздзеле «Русальны ці зялёны тыдзень. Сёмуха – Троіцын дзень» [3, с. 276].

Я. Х. Карскі адзначае, што адны элементы пахавальна-памінальнай абраднасці ўзніклі ў эпоху паганства, другая – у перыяд хрысціянства, а некаторыя ўзнікаюць у навейшы час [3, с. 388–389]. Погляды беларусаў на замагільнае жыццё, па меркаванні даследчыка, настолькі першабытныя і ў такой ступені адлюстроўваюць глыбокую старажытнасць, што па іх можна меркаваць аб далёкім мінулым [3, с. 389]. Я. Х. Карскі імкнецца вызначыць архаічныя і больш познія элементы, праводзіць паралелі паміж старажытнымі абрадамі і абрадамі ў пачатку XX ст. Даследчык выкарыстоўвае не толькі этнаграфічныя і фальклорныя матэрыялы, але і звесткі з летапісаў, старажытнай літаратуры.

У перыяд станаўлення беларускай савецкай этнаграфіі адной з найбольш змястоўных прац, якая ўтрымлівае матэрыялы па пахавальна-

памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння стаў зборнік А. А. Шлюбскага (у дзвюх частках) «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» (1927–1928 гг.). Другая частка зборніка была цалкам прысвечана сямейнаму быту і звычаёваму праву беларусаў Віцебшчыны. У гэтай частцы тэме пахавальна-памінальнай абраднасці прысвечана глава «Хаўтурныя галашэнні» [14, с. 217–229], якая складаецца з трох раздзелаў. У першым раздзеле («Вынік збіральніцкай працы папярэдніх этнографаў у галіне галашэнняў і хаўтурных звычаяў» [14, с. 219–220]) змешчаны бібліяграфічны спіс выданняў, якія ўтрымліваюць матэрыялы па пахавальна-памінальнай абраднасці. Спіс выданняў маецца па кожнаму павету Віцебскай губерні. У другім раздзеле («Хаўтурныя звычаі» [14, с. 221–222]) А. А. Шлюбскі змясціў шэраг прыкмет, якія тычацца розных бакоў пахавальна-памінальнай абраднасці, а таксама прывёў назвы галашэнняў на Віцебшчыне. У трэцім раздзеле («Тэксты галашэнняў» [14, с. 222–229]) змешчаны тэксты пятнаццаці галашэнняў, частка якіх запісана ўласна аўтарам, а частка ўзята з архіва кафедры этнаграфіі Інстытута Беларускай Культуры.

Этнаграфічнае вывучэнне беларускага этнасу ў 1920-я гг. не абмяжоўвалася рамкамі беларускай савецкай этнаграфіі. Навуковыя цэнтры ўзнікалі і за межамі БССР. Так, у Коўне (Літва) з 1923 па 1927 гг. В. Ю. Ластоўскі выдае навукова-літаратурны часопіс «Крывіч», у якім друкаваліся і этнаграфічныя даследаванні. Змястоўны матэрыял па каляндарнай памінальнай абраднасці беларусаў Дзісеншчыны ўтрымлівае артыкул В. Ю. Ластоўскага (пад псеўданімам Пагашчанін) «Крывічанскія дзяды» [5], які быў надрукаваны ў 1927 г. у часопісе «Крывіч». У артыкуле даследчык згадаў пра вясеннія («Наўскі Вялікдзень») і восеньскія («Вялікія») Дзяды. Першыя з іх, як адзначае аўтар, былі прысвечаны «наўцам» (нядаўна памерлым), а другія – цэламу роду [5, с. 67]. Уласна разгляду апошняга памінальнага абраду прысвечаны гэты артыкул. Апісанні памінальных традыцый заснаваны пераважна на ўласных назіраннях аўтара і ўспамінах яго

родных. У працы В. Ю. Ластоўскі параўноўвае памінальныя традыцыі сялян і дробнай шляхты Дзісеншчыны. Аўтар адзначае, што Дзяды ў сялянскага насельніцтва «з большай прымешкай паганскіх перажыткаў» [5, с. 67].

У 1933 г. у Вільні выходзяць метадычныя рэкамендацыі па збору этнаграфічных матэрыялаў «Увагі дзеля запісвання беларускай народнай творчасці і абрадаў» [10], падрыхтаваныя М. Пецюкевічам. Каштоўнасць дадзенай публікацыі заключаецца ў тым, што яна прысвечана выключна збору матэрыялаў па пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. У першым раздзеле («Агульныя ўвагі дзеля запісываньня беларускай народнай творчасьці і абрадаў» [10, с. 3–8]) даюцца агульныя парады па збору этнаграфічнага матэрыялу. Другі і трэці раздзелы («Праграма дзеля запісываньня пахароньніх абрадаў» [10, с. 9–23], «Памінальныя дні (“Дзяды”)» [10, с. 3–8]) змяшчаюць парады і канкрэтныя пытанні, прысвечаныя выключна пахавальна-памінальнай абраднасці.

Цікавасць да вывучэння пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў праяўлялася і замежнымі аўтарамі. Сярод польскамоўных прац, якія былі прысвечаны разгляду беларускіх памінальных традыцый у першай палове XX ст. важнае месца займаюць даследаванні Г. Віньчы (H. Wińcza) і Ю. Галомбэка (J. Gołąbek).

У 1904 г. у часопісе «Tygodnik Illustrowany» надрукаваны артыкул Г. Віньчы «Dziady na Litwie» [16]. У працы апісаны памінальныя традыцыі беларусаў на Восеньскія Дзяды і Прыкладзіны. Артыкул каштоўны змешчанымі ў ім фотаздымкі. На жаль, аўтар не пакінуў звестак аб тэрытарыяльным суаднясенні прадстаўленых апісанняў. Аднак існаванне характэрных асаблівасцей абрадавых дзеянняў (традыцыя гатаваць галаву пеўня або курыцы і прыносіць яе на магілу, наяўнасць рытуальнай стравы *«мілты»*) указвае на рэгіён беларуска-літоўскага памежжа. Падобныя традыцыі зафіксаваны на тэрыторыі сучасных Пастаўскага, Глыбоцкага і Докшыцкага раёнаў.

У 1925 г. у часопісе «Lud» апублікавана праца польскага даследчыка Ю. Галомбэка «Dziady Białoruskie» [15], у якой разгледжаны беларускія памінальныя традыцыі. У артыкуле Ю. Галомбэк даў агульную характарыстыку Дзядоў як царкоўнага свята і ўрачыстасці, якая ладзіцца дома, разгледзеў назву абраду, апісаў падрыхтоўку да свята і ход памінальнага застолля (асаблівасці абрадавай вячэры, абрадавыя стравы). У працы даследчык асобна разгледзеў восеньскія, зімовыя, вясеннія (Радаўніца), летнія і Стаўроўскія Дзяды. Крыніцамі даследавання сталі для Ю. Галомбэка апублікаваныя раней працы. Аўтар выкарыстаў і падзвінскія матэрыялы з прац М. Анімеле [1], М. Я. Нікіфароўскага [4], П. В. Шэйна [12].

Такім чынам, аналіз прац сведчыць аб тым, што комплекснага і ўсебаковага даследавання, прысвечанага пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння, у першай палове XX ст. не было праведзена. Нягледзячы на гэта, асобныя аспекты дадзенай праблематыкі разглядаліся рознымі аўтарамі і знайшлі адлюстраванне ў шэрагу публікацый. Працы адрозніваліся падыходамі, суадносінамі эмпірычнага і тэарэтычнага кампанентаў, задачамі і методыкай. У этнаграфічных даследаваннях пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў Падзвіння значнае месца займаў збор, першасная апрацоўка і публікацыя матэрыялаў. У гэты перыяд з'яўляюцца навукоўцы, чыя дзейнасць была скіравана не толькі на збіранне і публікацыю «сырога» этнаграфічнага матэрыялу, але на яго аналіз і тэарэтычнае асэнсаванне (Я. Х. Карскі, Ю. Галомбэк). Падзвінскія матэрыялы па пахавальна-памінальнай абраднасці былі прадстаўлены ў этнаграфічных працах агульнабеларускага характару.

## ЛІТАРАТУРА

1. Анимеле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимеле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111–268.

2. Иванов, Вас.Вас. Приметы и поверья крестьян Витебского уезда Витебской губернии / Вас.Вас. Иванов // Записки Северо-Западного отделения ИРГО. – Вильно, 1910. – Кн. 1. – С. 208–213.

3. Карский, Е.Ф. Белорусы / Е.Ф. Карский. – М.: Типо-литография Т-ва И.Н. Кушнеров и К°, 1916. – Т. 3 : Очерки словесности белорусского племени : Ч. 1 : Народная поэзия. – XIV, 557 с.

4. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], X, 307, 30 с.

5. Пагашчанін. Крывічанскія дзяды / Пагашчанін // Крывіч. – 1927. – № 12. – С. 66–69.

6. Пщелко, А.Р. Деды. Этнографический очерк из жизни Лепельских белорусов / А.Р. Пщелко. – Витебск : Губернская Типо-Литография, 1898. – 23 с.

7. Пщелко, А.Р. Микитовы хаутуры. Очерк из белорусской жизни / А.Р. Пщелко. – Витебск : Типо-Литограф. П.А. Подземского, 1910. – 53 с.

8. Пщелко, А.Р. Очерки и рассказы из жизни белорусской деревни / А.Р. Пщелко. – Вильно : Русский почин, 1906. – 248 с.

9. Свой. Поминовение усопших (из приходской жизни) / Свой // Полоц. епарх. ведомости. – 1906. – 15 окт. (неофиц. отдел). – С. 716–717.

10. Увагі дзеля запісвання беларускай народнай творчасці і абрадаў / Тав-ва прыяцеляў Беларусаведы пры У.С.Б. у Вільні. – Вільня: Выд-ва Тав-ва прыяцеляў Беларусаведы пры У.С.Б., 1933. – 31 с.

11. Шейн, П.В. Белорусские народные песни / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. П. Майкова, 1874. – 548 с.

12. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – СПб. : Тип. имп. акад. наук, 1890. – Т. 1. Ч. 2 : Бытовая и семейная жизнь белорусов в обрядах и песнях. – XXXIV, 712, [4] с.

13. Шендрик, Д.З. Распределение населения Верхнего Поднепровья и Белоруссия по территории, его этнографический состав, быт и культура / Д.З. Шендрик, М.В. Довнар-Запольский // Россия : Полное географическое описание нашего Отечества / под ред. В.П. Семенова. – СПб, 1905. – Т. 9 : Верхнее Поднепровье и Белоруссия. – С. 126–227.

14. Шлюбскі, А. Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны : у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.

15. Gołąbek, J. Dziady białoruskie / J. Gołobek // Lud. – 1925. – T. 4. – S. 1–40.

16. Wińcza, H. Dziady na Litwie / H. Wińcza // Tygodnik Illustrowany. – 1904. – № 44. – S. 835–836.